# Навукова – даследчая дзейнасць па гістарычнаму краязнаўству як галоўны этап патрыятычнага выхавання

*Мініч Віктар Рыгоравіч,*
*настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі,*
*кіраўнік гісторыка-краязнаўчага аб'яднання "Мой Край"*
*ДУА "Карчоўская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна*

Час у які мы жывем з'яўляецца перыядам глабальнай цывілізаванай трансфармацыі, эпоха змяненняў, якія ўсё часцей раптоўныя і нечаканыя. Таму наша задача на асэнсаванне запытаў будучыні становіцца яшчэ больш складанай.

Патрыятызм сёння - гэта сістэма каштоўнасцей, якімі валодае чалавек і грамадства. Гэта пачуццё любві да Радзімы, уласцівае масам людзей, усведамленне імі свайго абавязку і адказнасці перад ім і за яго будучыню. Гэта сукупнасць ідэй, эмоцый, настрояў, адносін, перакананняў і дзеянняў, накіраваных на росквіт сваёй краіны. Гэта дзейная любоў грамадзяніна да свайго народу і яго гісторыі. Патрыятызм закліка	ны стаць важнай рухаючай сілай пераадолення крызісу беларускага грамадства, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, умацаванне сувязяў паміж пакаленнямі. Ён у поўнай меры дапаможа чалавеку стаць сапраўдным грамадзянінам, паспяхова выконваць грамадзянскія абавязкі ў мірны і ваенны час.

З першых гадоў працы ў школе звярнуў увагу на шматбаковы патэнцыял гістарычнага краязнаўства як асноўнагасродка патрыятычнага выхавання. Якое дае найбольш шырокія магчымасці для фарміравання патрыятычнай свядомасці.

Краязнаўства агульнадаступна, дэмакратычна, дае магчымасць падлетку рэалізаваць сябе ў добрай справе пошуку, вывучэння і захавання помнікаў гісторыі і культуры. Бо для кожнага вялікая Радзіма пачынаецца з малой. Ад любві да зразумелага і блізкага, прыходзіць любоў да краіны. Пачуццё патрыятызму становіцца глыбей, калі дзеці больш даведаюцца пра гісторыю сваёй малой Радзімы, аб традыцыях і памятных месцах роднай зямлі, аб знакамітых земляках, аб вядомых асобах, якія бывалі тут, чэрпалі сілы для натхнення, творчасці, самаадданай грамадскай дзейнасці на карысць народа. Адным словам для таго каб навучыць чалавека любіць сваю Радзіму, трэба спачатку навучыць любіць яго і шанаваць сваю сям'ю, сваю вуліцу, сваю малую радзіму - свой родны край. Чалавек, які, не шануе свае карані, сваю старонку, не здольны палюбіць і сваю краіну.

Пачаў займацца арганізацыяй навукова-даследчай і пошукавай працы па гістарычнаму краязнаўству ў 2000-м годзе. Спачатку ў школе створаны гурткі – краязнаўчы, археалагічны і турыстычны. З 2008 года гурткі аб'яднаны ў адно гісторыка-краязнаўчае аб'яднанне "Мой Край". У назве нашага аб'яднання заключаецца і мэта нашай работы – вывучэнне Роднага краю. Гісторыка – краязнаўчае аб'яднанне стала навуковым цэнтрам у школе па арганізацыі даследчай дзейнасці сярод навучэнцаў не толькі ў краязнаўстве, але і ў іншых дысцыплінах.

Вывучэнне гісторыі непарыўна звязана з краязнаўствам. Краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі выкладаю асабіста сам або даю такую магчымасць навучэнцам, якія робяць паведамленні па пэўнай тэматыцы. Перш чым выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял у навучальным працэсе, вызначаю яго месца, сувязі і суадносіны з агульна-гістарычным матэрыялам тэмы ўрока.

Вялікая ўвага надаецца выкарыстанню інтэрнэт-тэхналогій пры падрыхтоўцы вучнямі навукова-даследчых прац, напісанні рэфератаў і г.д. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі пашыраюць магчымасці. Вэб-сайты дазваляюць навучэнцам знаходзіць патрэбную інфармацыю, пашыраюць магчымасці пры афармленні тэкставых дакументаў, фотаздымкаў і выкарыстанні інтэрнэту ў пошукавай дзейнасці.

Сёння для настаўніка актуальным застаецца пытанне. Як зацікавіць вучняў? Як дапамагчы ім дабіцца поспеху? Спіс гэтых "як" можа быць працягнуты, але вось дасканалага адказу на гэтыя пытанні няма.

У сваёй практыцы, для таго каб дзеці зацікавіліся даследчай працай, тэмай даследавання, на першапачатковым этапе прапаную праводзіць практычнае накіраванне ў даследаванні – экскурсіі, паходы, экспедыцыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, тэматычныя гутаркі, якія дазваляюць атрымаць першапачатковыя крыніцы інфармацыі. Калі ёсць практычныя веды, альбо знаходкі, працэнт зацікаўленасці дзяцей краязнаўчай працай павышаецца. Тады яны з задавальненнем аналізуюць літаратуру і іншыя крыніцы.

У практыцы арганізацыя краязнаўча-турыстычнай дзейнасці - галоўны этап зацікаўленасці вучняў навукова-даследчай дзейнасцю і павышэння цікавасці да прадмета гісторыя. Навучэнцы найбольш актыўна ўключаюцца ў даследаванне, калі яны непасрэдна самі дакранаюцца да гісторыі, атрымліваюць наглядныя, духоўныя, эмацыянальныя крыніцы ведаў. Вось тады і пачынаюць з'яўляцца ў іх пытанні. Навошта? Чаму? Для чаго? Як? І г.д. Як правіла, усе нашы адкрыцці ў навуковым даследаванні з'явіліся менавіта пасля правядзення такіх мерапрыемстваў.

Кожны год адпраўляемся ў турыстычныя паходы, праводзім цікавыя краязнаўчыя экспедыцыі, экскурсіі, як па свайму раёну так і далёка за яго межамі.

Гэта вядома вельмі цяжка і матэрыяльна і фізічна. Але на першым месцы стаіць цікавасць, імкненне даведацца пра нешта новае. Турыстычная падрыхтоўка з’яўляецца неабходнай умовай у фарміраванні здаровага ладу жыцця сярод вучняў у краязнаўчай дзейнасці. Бо як вядома краязнаўства немагчыма без турызму.

У выніку арганізаваных мерапрыемстваў на свет нараджаюцца навукова-даследчыя працы. Штогод ўдзельнічаем у раённым конкурсе работ даследчага характару. Апошнія 14 гадоў прадстаўляем раён на абласным узроўні, а тры разы прадстаўлялі Брэсцкую вобласць на рэспубліканскім узроўні. Кожны год вучні прадстаўляюць свае работы на рэспубліканскія конкурсы і канферэнцыі, удзельнічаюць у краязнаўчай алімпіядзе. Выступаюць з дакладамі на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўні дзе амаль заўсёды з’яўляюцца пераможцамі.

Даследчая праца са старшакласнікамі па вывучэнні гісторыі роднага краю ідзе пастаянна. Сярод вучняў знаходзяцца тыя, каму цікава адкрываць новыя старонкі ў гісторыі сваёй малой радзімы, раёна, вобласці, рэспублікі. А гэта азначае, што ім неабыякавая гісторыя сваёй малой радзімы, якую, як паказвае практыка, яны вельмі любяць і шануюць. А гэта значыць, маіх вучняў можна смела назваць патрыётамі сваёй Радзімы.

Такая разнастайная, цікавая для дзяцей праца гуртуе калектыў, дазваляе кожнай асобе праявіць сябе, адкінуць лішняе і ўмацаваць лепшыя якасці, паказаць свой сапраўдны пачатак, даць падставу запаважаць сябе самому і іншым, падстава для гонару сабой, класам, школай, сваімі продкамі і слаўнай гісторыяй свайго народа.

Выкарыстоўваючы даследчы метад у краязнаўстве, навучэнцы раскрываюць узаемасувязь агульнагістарычнага і мясцовага матэрыялу, становяцца не спажыўцамі гатовай інфармацыі, а саўдзельнікамі творчага працэсу. З кожным годам узрастае ўзровень выкананых навучэнцамі даследчых работ і якасці ведаў па гістарычным краязнаўстве.

Навукова-даследчая дзейнасць з'яўляецца найбольш прымальным і выніковым фактарам у фарміраванні грамадзяніна-патрыёта сваёй краіны.